**ЗАКЛЮЧЭННЕ**

савета па абароне дысертацый Д 01.42.03 па дысертацыі Буйко Цімура Сяргеевіча "Этымалагічныя гнёзды дэндралагічнай лексікі ў беларускай і польскай мовах на агульнаславянскім фоне: параўнальна-гістарычны аспект".

**1. Спецыяльнасць і галіна навукі, па якой прысуджаецца вучоная ступень.** Дысертацыя прадстаўлена на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова (філалагічныя навукі), 10.02.03 – славянскія мовы (філалагічныя навукі).

**2. Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці.** У дысертацыі праведзена даследаванне этымалагічных гнёздаў дэндралагічнай лексікі беларускай і польскай моў на агульнаславянскім фоне ў лінгвістычным і пазалінгвістычным аспектах, раскрыты культурныя і гістарычныя перадумовы ўзнікнення дэндралагічнай лексікі, паказаны асаблівасці фарміравання славянскай дэндраніміі, высветлены дэрывацыйныя сувязі і адноўлены страчаныя генетычныя суадносіны паміж роднаснымі лексічнымі адзінкамі ў этымалагічных гнёздах; вылучаны і ахарактарызаваны характэрныя семантычныя і словаўтваральныя працэсы пры ўтварэнні дэндралагічнай лексікі ў беларускай і польскай мовах; сфарміравана максімальна поўная слоўнікавая база яе сямі этымалагічных гнёздаў у беларускай і польскай мовах з вяршынямі **ops-*, **berz-*, **gruš-/*kruš-*, **dǫb-*, **kalin-*, **lip-*, **sosъn-*, якая налічвае 839 лексем; упершыню ў беларускім мовазнаўстве ў навуковы ўжытак уведзены новыя праславянскія, беларускія і польскія рэканструкцыі: было адноўлена 106 праславянскіх, 28 польскіх і 43 беларускія лексемы; устаноўлены характэрныя рысы словаўтваральных працэсаў у этымалагічных гнёздах дэндралагічнай лексікі.

**3. Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку прысуджаецца вучоная ступень.** Савет па абароне дысертацый Д 01.42.03 прысуджае Буйко Цімуру Сяргеевічу ступень кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.03 – славянскія мовы

за абгрунтаванне аднаго з кірункаў параўнальна-гістарычнага вывучэння лексікі, звязанага з даследаваннем асобных этымалагічных гнёздаў роднасных моў на агульнаславянскім фоне, што пашырае метадалагічную базу славянскай этымалогіі і дазваляе знайсці для лексікі славянскіх моў новыя этымалагічныя рашэнні;

за ўстанаўленне паходжання і шляхоў фарміравання славянскай дэндраніміі: выяўлены назвы індаеўрапейскага, балтаславянскага, праславянскага паходжання, а таксама спосабы ўтварэння дэндронімаў – марфалагічны (суфіксацыя – пры дапамозе фармантаў **-enъ/*-enь*, **-ica/*-iga/*-ika*, **-ina/*-yna*, **-isna/*-izna*, **-na* (**-sna/*-zna*), **-нь* (**-snь/*-znь*), **-rъ*, **-tъ*; прэфіксацыя – пры дапамозе прэфіксаў **ma-/*mo-*, **pa-/*po-*; складанне: **modrodervъ*) і марфолага-сінтаксічны (субстантывацыя ад'ектыўных формаў: **berza* < **berzъ(jь)*, **lipa* < **lipъ(jь)*);

за вызначэнне словаўтваральнага патэнцыялу праславянскіх дэндронімаў шляхам іх размеркавання ў складзе этымалагічных гнёздаў па ступенях дэрывацыі: гняздо з вяршыняй **dǫb-* – 312 лексем, гняздо з вяршыняй **lip-* – 127 лексем, гняздо з вяршыняй **berz-* – 117 лексем, гняздо з вяршыняй **sosъn-* – 92 лексемы, гняздо з вяршыняй **gruš-/*kruš-* – 80 лексем, гняздо з вяршыняй **ops-* – 74 лексемы, гняздо з вяршыняй **kalin-* – 37 лексем; устанаўленне залежнасці паміж колькасцю праславянскай лексікі ў рамках этымалагічных гнёздаў дэндралагічнай лексікі і значэннем адпаведнага дрэва ў традыцыйным побыце і культуры славян: істотная доля гарбарнай і дрэваапрацоўчай тэрміналогіі ў гняздзе з вяршыняй **dǫb-*, пчалярская тэрміналогія ў гняздзе з вяршыняй **lip-*, назвы каровы паводле іх масці ў гняздзе з вяршыняй **berz-*;

за ўвядзенне ў навуковы ўжытак новых праславянскіх, беларускіх і польскіх рэканструкцый (177 лексем), размеркаваных паміж этымалагічнымі гнёздамі наступным чынам: **ops-* – 16 лексем, **berz-* – 25 лексем, **gruš-/*kruš-* – 18 лексем, **dǫb-* – 61 лексема, **kalin-* – 12 лексем, **lip-* – 19 лексем, **sosъn-* – 26 лексем – што характарызуе славянскую, а ў яе складзе беларускую і польскую, дэндралагічную лексіку як адзін са старажытных лексічных пластоў;

за ўстанаўленне агульных рыс структурна-семантычнага складу і матывацыйных мадэлей намінацый (структурная і семантычная тоеснасць праславянскіх дэрыватаў; наяўнасць вялікай колькасці праславянскай лексікі, утворанай з дапамогай складаных фармантаў, якія субстантывуюць адпаведныя прыметнікі; падобнае развіццё семантыкі дэрыватаў у словаўтваральных ланцужках); вызначэнне адрозных рыс структурна-семантычнага складу і матывацыйных мадэлей намінацый (агульная колькасць лексем у гнёздах; колькасць апорных асноў для дэрывацыі; наяўнасць характэрных словаўтваральных мадэлей; прадстаўленасць паасобных тэматычных груп лексікі); выяўленне дэрывацыйных фармантаў, вызначаных шляхам рэканструкцыі корпуса дэндралагічнай лексікі беларускай і польскай моў, з улікам іх прадуктыўнасці, якая паўплывала на колькасць праславянскай лексікі ў складзе этымалагічных гнёздаў і прадвызначыла асаблівасці развіцця семантыкі кантынуантаў.

**4. Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў даследавання.** Атрыманыя ў ходзе даследавання вынікі знойдуць выкарыстанне ў далейшым сінхронным і дыяхронным вывучэнні лексікі славянскіх моў, у тым ліку пры асвятленні пытанняў такіх філалагічных дысцыплін, як параўнальна-гістарычнае мовазнаўства, этымалогія, этналінгвістыка, лексікалогія і лексікаграфія. Яны могуць быць прыменены пры правядзенні спецкурсаў па этымалогіі, славянскім і індаеўрапейскім мовазнаўстве для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь; пры стварэнні падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў па названых дысцыплінах; пры распрацоўцы тэм курсавых, дыпломных і магістарскіх работ; пры складанні этымалагічных слоўнікаў і даведнікаў (асабліва гнездавога тыпу, дзе адлюстроўваюцца актуальныя і адноўленыя дэрывацыйныя сувязі паміж словамі), а таксама адмысловага слоўніка праславянскай дэндралагічнай лексікі з указаннем кантынуантаў, іх значэнняў і апісаннем семантычнага развіцця з апорай на этналінгвістычныя, гістарычныя і культуралагічныя даныя.

Старшыня савета па абароне дысертацый Д 01.42.03 — В.П. Русак

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый Д 01.42.03 — Н.В. Паляшчук

23.01.2024 г.